# СТРУКТУРА РАЙВЫКАНКАМА

**Старшыня райвыканкама Кузняцоў І.В.**

- аддзел унутраных спраў;
- фінансавы аддзел.

*Кіруе дзейнасцю раённага выканаўчага камітэта, яго структурных падраздзяленняў, падведамных выканкаму арганізацый. Ажыццяўляе ўзаемадзеянне з абласным выканаўчым камітэтам, іншымі абласнымі органамі дзяржаўнага кіравання і раённым Саветам дэпутатаў. Курыруе пытанні аддзела ўнутраных спраў, бюджэту і фінансаў*

**Першы намеснік райвыканкама Шокель А.К.**

- упраўленне па сельскай гаспадарцы і харчаванню.
- аддзел землеўпарадкавання;

*Курыруе пытанні аграпрамысловага комплексу раёна, харчовых рэсурсаў, вытворчасці і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, фермерства, забеспячэння насельніцтва харчаваннем, зямельных адносін, аховы навакольнага асяроддзя*

**Намеснік райвыканкама**

- аддзел эканомікі.

*Курыруе пытанні эканомікі: прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна, усіх формаў уласнасці, уключаючы камерцыйныя структуры, кіравання дзяржмаёмасцю і камунальнай уласнасцю, гандлёвага і бытавога абслугоўвання насельніцтва, працы прамысловых прадпрыемстваў, сувязі, укаранення нарматываў сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва, статыстыкі і аналізу, прадпрымальніцтва, працы і заработнай платы, знешнеэканамічных сувязяў, рэгістрацыі фізічных і юрыдычных асоб, ліцэнзаванне, вядзенне тэрытарыяльнага рэгістра ЕГР, рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця малых гарадскіх паселішчаў, інвестыцыйных праграм, стварэння новых працоўных месцаў.*

**Намеснік райвыканкама Лясовіч Л.І.**

- аддзел архітэктуры і будаўніцтва, жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

*Курыруе пытанні праектавання і будаўніцтва аб'ектаў вытворчай і сацыяльнай сферы, будаўніцтва і ўтрымання дарог, транспарту, жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання населеных пунктаў, надзвычайных сітуацый, паліўна-энергетычнага комплексу, уладкавання дзяржаўнай мяжы, каардынацыі дзейнасці па пытаннях збору другаснай сыравіны.*

**Намеснік райвыканкама Стальмачонак Т.А.**

- аддзел арганізацыйна-кадравай работы;
- аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі;
- аддзел па адукацыі;
- упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне;
- сектар спорту і турызму.

*Курыруе пытанні расстаноўкі і перападрыхтоўкі кадраў, арганізацыйнай працы, узнагарод, правядзення выбараў і рэферэндумаў, узаемадзеяння з сельскімі саветамі дэпутатаў, рэлігійнымі арганізацыямі і нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі, ветэранскімі арганізацыямі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі сацыяльна-культурнай накіраванасці, рэалізацыі дзяржаўнай ідэалогіі, грамадска-палітычнай інфармацыі, дзяржаўнай моладзевай палітыкі, аналізу і прагназавання сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў раёне, узаемадзеяння з палітычнымі партыямі і грамадскімі арганізацыямі, СМІ. Ажыццяўляе кіраўніцтва развіццём сферы адукацыі, культуры, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, фізічнай культуры, спорту і турызму.*

**Кіраўнік спраў Драба В.А.**

- упраўленне справамі;
- аддзел запісу актаў грамадзянскага стану;
- сектар па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб;
- группа бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці.

*Ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва службамі прававога, арганізацыйнага і тэхнічнага, транспартнага і гаспадарчага абслугоўвання працы выканкама, афармленне іх пратаколаў. Курыруе пытанні са зваротамі грамадзян, справаводства і ажыццяўляе кантроль за выкананнем дакументаў.*